УДК 378.147.227

# ТЭСТАВАННЕ ЯК СРОДАК ДЫЯГНОСТЫКІ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫХ ВЕДАЎ (З ВОПЫТУ ПРАЦЫ)

**Пушкін І.А.**
Установа адукацыі
«Магілеўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»
г. Магілеў, Рэспубліка Беларусь

На першай ступені вышэйшай адукацыі прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры гуманітарных дысцыплін МДУХ з дапамогаю сучасных тэхналогій забяспечвае набыцце будучымі спецыялістамі наступных акадэмічных і сацыяльна-асабовых кампетэнцый: валодаць і ўжываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач, валодаць сістэмным і параўнальным аналізам, даследчымі навыкамі, умець працаваць самастойна, быць здольным інтэграваць новыя ідэі (крэатыўнасць), валодаць якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму, быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння і міжасобасных камунікацый, да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне), умець працаваць у камандзе, што садзейнічае фарміраванню сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі тэхнічнага профілю. Гэта дасягаецца шляхам засваення сацыяльна-гуманітарных ведаў, якія студэнты атрымліваюць у час правядзення лекцыйных і семінарскіх заняткаў па дысцыплінах “Гісторыя”, “Паліталогія”, “Філасофія” і інш.

Для далучэння студэнтаў да пошуку, засваення і кіравання ведамі, набыцця вопыту самастойнага рашэння розных задач выкладчыкамі кафедры гуманітарных дысцыплін выкарыстоўваюцца: сучасныя тэхнічныя сродкі навучання (мультымедыйнае абсталяванне і відэаматэрыялы), тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, вучэбна-даследчай дзейнасці, праектныя, камунікатыўныя (дыскусія, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады), гульнявыя тэхналогіі, аналіз сітуацыі,  наведванне музеяў, выстаў і інш.

Для арганізацыі і правядзення дыягностыкі засваення сацыяльна-гуманітарных ведаў выкарыстоўваюцца наступныя формы: вусныя (сумоўі, даклады на канферэнцыях, вусныя экзамены або залікі), пісьмовыя (прамежкавае тэставанне, кантрольныя апытанні, справаздачы па навукова-даследчай працы), вусна-пісьмовыя (ацэньванне на аснове крэдытнай і модульна-рэйтынгавай сістэмы) і тэхнічныя (электроннае тэставанне).

Адным з распаўсюджаных метадаў педагагічнай дыягностыкі з’яўляецца метад тэставання. Ен прадугледжвае прымяненне навучальнага матэрыялу для вырашэння практычных і тэарэтычных задач, можа выкарыстоўвацца на любым узроўні вучэбнай дзейнасці. Тэст з выбарам адказу звязаны з дзейнасцю ў сітуацыі выбару прымальнага і адхілення непрымальнага, з чым чалавек сустракаецца на кожным кроку. Тэсты дазваляюць у самы кароткі тэрмін праверыць веды вялікіх груп студэнтаў, выявіць прабелы пры выкладзе навучальнага матэрыялу, прымяніць метады матэматычнай статыстыкі для ацэнкі ступені яго засваення усімі і г.д. Распрацоўка тэставага кантролю ўключала наступныя этапы: вызначэнне мэтаў тэставання, адбор і парадкаванне заданняў, кампаноўка тэстаў па блоках, апрабацыя, правядзенне тэставых выпрабаванняў. Да тэстаў прад’яўляліся шэраг патрабаванняў: валіднасць, пэўнасць, надзейнасць, практычнасць, прастата ў выкарыстанні, прагнастычная каштоўнасць. Пры выбары крытэрыяў ацэнкі тэстаў улічваліся разумовыя навыкі, якія павінны быць атрыманыя падчас навучання. Тэсты, распрацаваныя з улікам узроўняў засваення, дазваляюць ацаніць якасць засваення.

Згодна мэтаў у вобласці якасці (СМК) кафедры гуманітарных дысцыплін на 2013 г. абсалютная паспяховасць (АП) студэнтаў вочнай формы навучання павінна была скласці 86 % (для завочнай формы – 75 %), якасная паспяховасць (ЯП) – 61 % (35 %). Па выніках 2013 г. дасягнуты паказчыкі: для вочнай формы навучання АП – 94,99 %, ЯП – 68 %; для завочнай АП – 86,6 %, ЯП – 32,29 %. Запланаваныя паказчыкі на 2014 г.: для студэнтаў вочнай формы

навучання АП павінна скласці 90 %, для завочнай формы – 80 %, ЯП адпаведна 65 % і 35 %. Па выніках I паўгоддзя 2014 г. дасягнуты паказчыкі: для вочнай формы навучання АП – 98,3 %, ЯП – 65 %; для завочнай АП – 85,08 %, ЯП – 40,45 %.

Паспрабуем прааналізаваць станоўчыя і адмоўныя бакі тэставання як сродка дыягностыкі сацыяльна-гуманітарных ведаў па выніках вопыта працы за 2012–2014 гг.

На момант збору статыстычнага матэрыялу вучэбная праграма па дысцыпліне “Гісторыя” для студэнтаў эканамічных і механічных спецыяльнасцей дзеннай і завочнай форм атрымання адукацыі прадугледжвала правядзенне заліку.

Сярод студэнтаў 1 курса механічнага факультэта ацэньванне на аснове крэдытнай і модульна-рэйтынгавай сістэмы дазволіла атрымаць залік датэрмінова толькі 11 студэнтам з усіх груп (10,1 %). Электроннае тэставанне (гл. табліцу 1) выявіла не толькі паспяховасць засваення ведаў, але і іх узровень па дзесяцібальнай сістэме.

Табліца 1 – Вынікі электроннага тэставання па “Гісторыі” (МФ, 1 курс)

| Група | Колькасць студэнтаў | Атрыманыя адзнакі | | | | | | | | Не з’явіліся | Атрымалі адзнаку датэрмінова | АП (%) | ЯП (%) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | | | | |
| МА | 22 | | 2 | 2 | 2 | 3 | 5 | 1 | | 3 | 4 | 86,6 | 77,5 |
| МА | 23 | 1 | 1 | 2 | 3 | 6 | 4 | 2 | 1 | | 3 | 90,0 | 69,5 |
| АТПП | 28 | 1 | 3 | 8 | 4 | 4 | 4 | 2 | | 1 | 1 | 84,6 | 32,2 |
| НТ | 13 | | 2 | 5 | 4 | 1 | 1 | | | | | 84,6 | 15,4 |
| НТ | 23 | | 1 | 5 | 2 | 5 | 1 | 3 | 1 | 2 | 3 | 94,4 | 56,5 |

Студэнты, якія па розных прычынах не з’явіліся на залік, або атрымалі нездавальняючую адзнаку на тэставанні, затым здавалі залік у вуснай форме. У выніку АП склала: у 2 групах МА і 1 групе НТ – 100 %, АТПП – 96,4 %, НТ – 92,3%. Сярэдняя АП па курсу склала – 97,74 %. Для параўнання па выніках тэставання: АП – 88,04 %, ЯП – 50,22 %. Улічваючы запланаваныя і дасягнутыя паказчыкі кафедры гуманітарных дысцыплін у вобласці якасці на 2013 г., можна пабачыць, што электроннае тэставанне дазволіла атрымаць значна ніжэйшыя паказчыкі.

Тыя ж самыя студэнты вывучалі дысцыпліну “Гістарычная і культурная спадчына г. Магілева”, дзе быў прадугледжаны залік у вуснай форме. На аснове крэдытнай і модульна-рэйтынгавай сістэмы датэрмінова атрымалі залік 60 студэнтаў (60 %). З 40 студэнтаў, што здавалі залік вусна, не атрымалі станоўчую адзнаку – 5 чал. У выніку АП у 2 групах НТ і 1 групе МА склала 100%, у групе МА – 85,5%, АТПП – 92,3%, сярэдняя па курсе – 95,56 %. Розніца з сярэднім паказчыкам АП па дысцыпліне “Гісторыя” не вялікая. Паказчык АП па дысцыпліне “Гістарычная і культурная спадчына г. Магілева” перабольшвае як атрыманы у сярэднім па кафедры, так і вынікі электроннага тэставання па дысцыпліне “Гісторыя”.

Табліца 2 – Вынікі электроннага тэставання па “Гісторыі” (ЭФ, 1 курс)

| Група | Колькасць студэнтаў (замежных) | Атрыманыя адзнакі | | | | | | | Атрымалі адзнаку датэрмінова | АП (%) | ЯП (%) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | | |
| ТЭТ | 22 (2) | 3 | 2 | 3 | 3 | 2 | | 3 | 5 | 76,2 | 50,0 |
| БУП | 21 (4) | | 2 | 6 | 2 | | 1 | 1 | 5 | 88,2 | 41,2 |
| ЭОП | 16 (1) | 1 | 3 | 3 | 2 | 2 | 1 | 1 | 2 | 73,3 | 40,0 |
| ЭПП | 15 | | 2 | | 3 | 1 | 2 | 1 | 6 | 86,6 | 66,6 |
| Планавыя паказчыкі 2013 г. | | | | | | | | | | 86,0 | 61,0 |
| Атрыманыя паказчыкі ў цэлым па кафедры за 2013 г. | | | | | | | | | | 94,99 | 68,0 |
| Атрыманыя паказчыкі на тэставанні ў сярэднім па курсу | | | | | | | | | | 81,1 | 49,45 |

Звернемся да дыягностыкі ведаў па дысцыпліне "Гісторыя" сярод студэнтаў 1 курса эканамічнага факультэта. Канчатковы паказчык здачы заліка АП – 100 % ва ўсіх групах. На аснове крэдытнай і модульна-рэйтынгавай сістэмы датэрмінова атрымалі залік 18 студэнтаў (24,32 %). Замежныя студэнты здавалі залік асобна ў вуснай форме. Вынікі электроннага тэставання прадстаўлены ў табліцы 2. Іх аналіз дазваляе адзначыць тыя ж тэндэнцыі, што праявіліся пры правядзенні электроннага тэставання сярод студэнтаў механічнага факультэта.

Студэнты завочнай формы атрымання адукацыі па дысцыпліне "Гісторыя" падчас вуснага заліку паказалі наступныя паказчыкі АП: ТЭЗ, БУАЗ – 100%, ФКЗ – 54,2 %, ЭОПЗ – 75 %, ЭППЗ – 93,7 %. Сярэдні склаў – 84,58% (запланаваны 80 %).

Цікавую інфармацыю для пэўнага параўнальнага аналізу даюць нам вынікі вуснага экзамена па дысцыпліне "Паліталогія" сярод студэнтаў эканамічнага (3 курс, 74 чал.) і хіміка-тэхналагічнага (2 курс, 145 чал.) факультэтаў дзеннай формы атрымання адукацыі (гл. табліца 3). На аснове крэдытнай і модульна-рэйтынгавай сістэмы датэрмінова атрымалі адзнакі 28 студэнтаў (12,78 %), па выніках справаздач па навукова-даследчай працы і дакладаў на канферэнцыях 22 (10,05 %). Узровень ведаў дадзеных катэгорый студэнтаў ацэньваўся баламі не ніжэйшымі за "7".

Табліца 3 – Вынікі вусных экзаменаў па "Палітaлогіі" (ЭФ і ХТФ).

| Групы | ЭОП | ЭПП | ТЭТ | ТПОП | ТПОП | ТХВ | ТЖМ | ТЖМ | ТЖМП | ТЖМП |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| АП (%) | 100 | 100 | 100 | 85,7 | 95,5 | 71,4 | 100 | 100 | 82,3 | 100 |
| ЯП (%) | 54,5 | 48,0 | 72,0 | 61,8 | 68,2 | 57,1 | 50,0 | 75,0 | 47,1 | 66,6 |
| Атрыманыя паказчыкі на тэставанні ў сярэднім па курсу | | | | | | | | | | |
| АП (%) | 100 | | | 90,7 | | | | | | |
| ЯП (%) | 58,17 | | | 60,83 | | | | | | |

У выніку вусных экзаменаў атрыманыя паказчыкі АП вышэйшыя за планавыя і ніжэйшыя па ЯП. У той жа час паказчыкі АП і ЯП па выніках вуснага экзамена значна вышэй чым электроннага тэставання.

Такім чынам, аналізуючы арганізацыю і правядзенне тэставання як сродка дыягностыкі сацыяльна-гуманітарных ведаў па выніках вопыта працы за апошнія два гады, можна зрабіць некаторыя высновы. Безумоўна, тэсты ў пэўнай ступені спрыяюць развіццю разумовай дзейнасці, дабратворна ўплываюць на развіцце інтуіцыі і лагічнага мыслення, дазваляюць правесці шырокі і глыбокі кантроль за засваеннем матэрыялу.

Электроннае тэставанне засведчыла атрыманне паказчыкаў узроўню паспяховасці ніжэй запланаваных і атрыманых у вобласці палітыкі якасці кафедры гуманітарных дысцыплін. Таму неабходна ўдасканальваць як методыкі выкладання гуманітарных дысцыплін, так і правядзення розных форм дыягностыкі ведаў і кампетэнцый. Электроннае тэставанне гэта даволі аб'ектыўны спосаб праверкі ведаў, але ен даволі часта прымушае студэнтаў не думаць, а ўгадваць (у лепшым выпадку). Правядзенне вусных залікаў і экзаменаў дазваляе выкладчыку ўбачыць падчас адказу тое, што застаецца па-за ўвагаю тэста – здольнасць студэнта да аналізу, яго лагічнае і крытычнае мысленні, здольнасць апераваць фактамі, крэатыўнасць, камунікацыйнасць і іншае, што і складае сутнасць акадэмічных і сацыяльна-асабовых кампетэнцый спецыяліста.

Сення адзначаецца паніжэнне ўзроўня ведаў студэнтаў у параўнанні з кантынгентам пяці дзесяці гадовай даўніны. Сітуацыю з засваеннем ведаў неабходных для належнага фарміравання патрэбных кампетэнцый вельмі складана выправіць, нават з дапамогаю выкарыстоўвання сучасных інавацыйных педагагічных методык і інфармацыйных тэхналогій. Гэтаму істотна перашкаджае зробленае ў апошнія гады скарачэнне аўдыторных гадзін па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага блоку. Нізкі ўзровень ведаў, атрыманых у сярэдняй школе, скарачэнне гадзін ва ўстановах вышэйшай адукацыі прыводзяць да зніжэння паказчыкаў у вобласці якасці і несфарміраванасці кампетэнцый.